

У Мінску ў дзень адкрыцця мотасезона 20 красавіка Дзяржаўтаінспекцыя дасць магчымасць кіроўцам, якія маюць катэгорыю «В» і жадаюць адкрыць «А», здаць практычны экзамен тут жа перад пачаткам байкерскага шэсця. СТАР 2



Гісторык моды, вядучы праграмы «Модны прысуд» Аляксандр Васільеў адказаў на пытанні, ці магчыма прадказаць заканамернасці ў модзе, што з'яўляецца сімвалам нашай эпохі і як зрабіць мужчыну стыльным. СТАР 6



У мужчынскім адзіночным фігурным катанні надзеі звязваюцца з 19-гадовым фігурыстам Паўлам Ігнаценкам. Ён лічыць, што трэніравацца можна дзе заўгодна, але выступаць хоча за родную Беларусь. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 КРАСАВІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 73 (27438) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАСЛАННЕ ПРЭЗІДЭНТА — У ПРАМЫМ ЭФІРЫ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 19 красавіка звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Выступленне кіраўніка дзяржавы будзе трансліравацца ў прамым эфіры па тэлеканале «Беларусь 1» і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Трансляцыя з Авальнай залы Дома ўрада пачнецца ў 11.00. Тэлеверсія Паслання будзе паказана ў вячэрнім эфіры беларускіх тэлеканалаў. На мерапрыемства запрошаны вышэйшыя службовыя асобы краіны, члены ўрада, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, буйнейшых прадпрыемстваў, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, сродкі масавай інфармацыі.

## СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ ЗША Ў СУВЯЗІ З АХВЯРАМІ ВЫБУХУ НА ХІМЗАВОДЗЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Злучаных Штатаў Амерыкі Бараку Абаме, а таксама накіраваў словы падтрымкі родным і блізкім загінулых і пацярпелых у выніку выбуху на хімічным заводзе ў горадзе Уэст штата Тэхас. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

## БЕЛАРУСЬ І ЛІТВА ПЕРАХОДЗЯЦЬ ДА ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч прыбыў у Клайпеду на чале беларускай дэлегацыі для ўдзелу ў беларуска-літоўскім эканамічным форуме, які праходзіць гэтымі днямі, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Гэта штогадовае мерапрыемства, на якім абмяркоўваюцца пытанні гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння. Таксама ў гэты час у Клайпедзе адбудуцца першае сумеснае пасяджэнне беларускага і літоўскага дзелавых саветаў па эканамічным і гандлёвым супрацоўніцтве, кантактна-кааперацыйная біржа. Агульная колькасць удзельнікаў мерапрыемства ад Беларусі, Літвы, Фінляндыі складзе амаль 300 чалавек.**

Міхаіл Мясніковіч сустрэўся са сваім літоўскім калегам Альгірдасам Буткявічусам. Прэм'ер-міністры абмеркавалі перспектывы развіцця беларуска-літоўскага эканамічнага супрацоўніцтва, шэраг сумесных праектаў, якія рэалізуюцца ў Літве, а таксама намецілі перспектыўныя напрамкі інтэграцыйнага ўзаемадзеяння.

Міхаіл Мясніковіч падзякаваў літоўскаму боку за магчымасць сустрэцца і абмеркаваць надзённыя пытанні. «Урады павінны ствараць камфортныя ўмовы для таго, каб нашы кампаніі паспяхова вырашалі пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», — адзначыў ён.

Цяпер дзяржавы пераходзяць да інвестыцыйнага супрацоўніцтва, канстатаваў Міхаіл Мясніковіч. Беларусь — важны эканамічны партнёр Літвы, у тым ліку ў сферы транспарту, падкрэсліў Альгірдас Буткявічус. У гэтай сферы ёсць рэзервы для супрацоўніцтва, упэўнены літоўскі прэм'ер. «Хацелася б, каб літоўскія кампаніі яшчэ больш паспяхова выкарыстоўвалі свае нішы на беларускім рынку, а беларускія кампаніі разглядалі Літву як вароты на рынкі Еўрасаюза», — адзначыў ён. «Беларусь мае патэнцыял развіцця ў адносінах з ЕС», — падкрэсліў літоўскі прэм'ер-міністр. Літва прываблівае для Беларусі як вароты Еўрапейскага саюза, лічыць ён. А літоўскае старшынства ў ЕС з'яўляецца добрай магчымасцю для абнаўлення адносін ЕС і Беларусі. «Літва гатова дапамагчы Беларусі ісці па гэтым шляху», — дадаў Альгірдас Буткявічус.

Міхаіл Мясніковіч пасля сустрэчы паведаміў журналістам, што «Беларуськалій» фактычна купіў 30 працэнтаў тэрмінала сухіх насыпных грузаў. Гэта вельмі вялікі тэрмінал. Я лічу, што гэтыя інвестыцыі ў памеры $30 млн — добрыя інвестыцыі», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Такім чынам, пакет акцый тэрмінала ў памеры 30 працэнтаў належыць ААТ «Беларуськалій», растлумачыў ён. Беларусь інвесціруе ў эканоміку Літвы.

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, кіраўнік літоўскага ўрада наведае Беларусь з візітам у чэрвені 2013 года. «Мы абмяркуем шэраг канкрэтных праектаў. Я вельмі рады, што пасля пэўнага двухгадовага зацішша мы зноў уступілі ў фазу даволі актыўнага дыялогу ўрадаў, і гэта радуе бізнес-колы», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

«Лічым, што ў перыяд старшынства Літвы ў ЕС у 2013 годзе мы проста абавязаны рэалізаваць дадатковыя магчымасці па лініі Беларусь — ЕС, сур'ёзна рушыць наперад па шляху нармалізацыі беларуска-еўрапейскіх адносін. І гэта, упэўнены, будзе па заслугах ацэнена гісторыяй. Палітыка санкцый, ультыматумаў і дыктату абсалютна бесперспектыўная, і яна павінна адысці ў мінулае», — заявіў Міхаіл Мясніковіч.

Ён нагадаў, што Прэзідэнт Беларусі вылучыў ініцыятыву «Інтэграцыя інтэграцый» для фарміравання шырокай платформы супрацоўніцтва і эканамічнай кааперацыі на прасторы ад Уладзівастока да Лісабона. «Гэта рэальны еўразійскі праект на прынцыпах свабоды гандлю, недыскрымінацыі, узаемнай павагі і канструктыўнага дыялогу народаў, якія насяляюць наш кантынент», — падкрэсліў беларускі прэм'ер.





# СНЯДЗІН — НЕ ВЕНЕЦЫЯ, ХОЦЬ І НА ВАДЗЕ

**Вёска Снядзін Петрыкаўскага раёна гэтымі днямі нагадвае сапраўдную Венецыю. Але гэтае параўнанне для вёскі і яе жыхароў зусім не радаснае. Тут цалкам адрэзанымі вадою аказаліся некалькі вуліц, а 46 дамоў патрапілі ў сапраўдны водны палон: без лодкі з хаты і падворка не выбрацца.**

Снядзін — вёска пераважна старых людзей. І гэтай катэгорыі насельніцтва без дапамогі іншых са стыхіяй не справіцца. Вада стала прыходзіць у хаты, хоць да апошняга моманту снядзінцы спадзяваліся, што яна будзе толькі госцяй падвор'яў, а да жылых памяшканняў усё ж не дабярэцца.

Вада прымусіла многіх жыхароў часова перасяліцца ў іншыя дамы, паклапаціцца пра бяспеку хатняй жывёлы, знайсці для яе сухое і надзейнае месца.

Вяскоўцам нічога не застаецца, як толькі чакаць, калі вада нарэшце пачне спадаць. Здавалася б, вясновыя паводкі ў Снядзіне і ўсёй запрыпяцкай зоне — з'ява адвечная і нават звыклая. Многія сённяшнія жыхары бачылі і не такое. Аднак яны ўспрымаюць гэтую прыродную з'яву з пачуццём нейкай крыўды. Ім хочацца большай увагі да сябе з боку мясцовых улад, лепшай працы медыцынскай службы, шырокага асартыменту прадуктаў у краме.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**





## ЦЫТАТА ДНЯ



**Антон КРАЕЎСКІ, старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама:**

***«Сітуацыю ў рэальным сектары эканомікі Мінска пагаршае недахоп кадраў рабочых спецыяльнасцяў. Найбольш запатрабаваныя прафесіі — слесары, вадзіцелі, мантажнікі, тынкоўшчыкі, токары, наладчыкі, інжынеры. У прамысловасці налічваецца 5500 вакансій — 22% ад іх агульнай колькасці, у будаўніцтве — 6,4 тысячы, у сувязі — 2,8 тысячы. Дарэчы, намінальная налічаная заработная плата работнікаў Мінска за студзень-люты склала Br5 млн 774,6 тыс. пры прагнозе на 2013 год Br5 млн 880 тыс. У параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года намінальная заработная плата вырасла на 53,8%, рэальная зарплата (з улікам росту спажывецкіх цэн) — на 25,1%».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.04.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8660,00 | ▲ |
| Еўра | 11300,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 273,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1063,56 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 19° |
| Віцебск | + 20° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 19° |

■ Год беражлівасці

# АДХОДЫ Ў ДАХОДЫ

**Першы завод па перапрацоўцы зношаных аўтамабільных шын у Беларусі пачаў працаваць на тэрыторыі Мінскага абласнога тэхнапарка, што ў Смалявіцкім раёне. З работай прадпрыемства азнаёміліся намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін і старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура.**

Інавацыйны праект уключаны ў Дзяржаўную праграму збору (нарыхтоўкі) і перапрацоўкі другаснай сыравіны ў Беларусі на 2009 -2015 гады. Магутнасці прадпрыемства дазволяць перапрацоўваць 4 тоны шын у гадзіну, што дасць магчымасць атрымліваць не менш за 40 млрд рублёў штогод. Акрамя таго, тут створана 35 рабочых месцаў, а выручка на аднаго чалавека павінна скласці 102,4 тыс. долараў ЗША.

Вытворчая лінія на заводзе цалкам аўтаматызаваная. Абсталяванне мае павышаны статус бяспекі як для саміх работнікаў, так і для навакольнага асяроддзя. У выніку будзе атрымана высакаякасная гумавае крошка, 70 працэнтаў якой плануецца пастаўляць у Расійскую Федэрацыю, а тое, што застанецца, выкарыстоўваць на ўнутраным рынку. Адначасова з вытворчасцю ажыццяўляецца збор і захаванне зношаных шын. Сёння запас складае каля 3000 тон.

Як адзначыў Анатоль Калінін, Мінскі абласны тэхнапарк — адзін з першых, дзе сканцэнтраваны новыя тэхналогіі, якія даюць высокі дабаўлены кошт. «Мінскі аблвыканкам сур'ёзна займаецца пытаннямі перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў. Мы ўбачылі даволі ўнікальную сучасную перапрацоўку шын — вытворчасць такога ўзроўню ў Беларусі першая. У цэлым шыны ўтылізуюцца шляхам спальвання на цэментных заводах. Гэта няправільна. Мы павінны перапрацоўваць іх і выпускаць гумавыя тэхнічныя вырабы для эканомікі», — канстатаваў віцэ-прэм'ер.

Азнаёміўся Анатоль Калінін і з тэхналогіяй перапрацоўкі складанай бытавой тэхнікі. Такая вытворчасць адкрыецца сёлета ў лістападзе. «Гэта будзе першы праект у рэспубліцы, які дазволіць перапрацоўваць халадзільнікі, тэлевізары, камп'ютары і іншыя бытавыя вырабы», — зазначыў ён.

Пабываў прадстаўнік урада і на вытворчасці па прамысловай загартоўцы фасаднага шкла, якая не мае аналагаў у Беларусі. Сюды ўкладзена больш за мільён долараў ЗША інвестыцый, створана 30 рабочых месцаў. Прадпрыемства плануе асвоіць выпуск гнутага, мультыфункцыянальнага, энергазберагальнага, шматслойнага, пуленепрабівальнага шкла. Пасля тэрмічнай апрацоўкі прадукцыя будзе выкарыстоўвацца ў будаўніцтве, медыцыне, сельскай гаспадарцы, аўтамабілебудаванні, вытворчасці прамысловага, гандлёвага абсталявання, халадзільных вітрын.

Напрыканцы віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў краіне распрацавана канцэпцыя па здабычы другасных матэрыяльных рэсурсаў з камунальных бытавых адходаў. Сёлета плануецца асвоіць іх на 15 млн долараў ЗША, а таксама пабудаваць шэраг заводаў па сартаванні і перапрацоўцы. Гэта такія вытворчасці, як у Гродне, Салігорску, Светлагорску, Барысаве і іншых гарадах. Першы сучасны завод узведзены ў Брэсце. Працуе ён эфектыўна і прыбыткова. «У цэлым праграма збору, перапрацоўкі, здабывання другасных матэрыяльных рэсурсаў набірае тэмпы. Мы б хацелі, каб да Мінскай вобласці падключыліся і іншыя рэгіёны. На жаль, адстае ў гэтым плане Віцебская вобласць. Мы будзем аказваць садзейнічанне па стварэнні падобных вытворчасцяў», — сказаў Анатоль Калінін.

Па словах Барыса Батуры, такія прадпрыемствы — прыклад беражлівасці і правільнага падыходу да мадэрнізацыі прамысловасці, узор таго, як трэба працаваць. «Мадэрнізацыя заключаецца ў тым, каб ствараць высокатэхналагічныя прадпрыемствы з высокай выпрацоўкай на аднаго работніка», — падкрэсліў губернатар.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ДА ВЫХАДНЫХ ПАХАЛАДАЕ

Галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук паведаміла, што ў пятніцу, 19 красавіка, ноччу ападкаў не чакаецца. Раніцай і днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Ноччу тэмпература паветра будзе ад 3 да 9 градусаў цяпла, удзень чакаецца 13-19 градусаў са знакам плюс, на паўднёвым усходзе — да плюс 22 градусаў. Кароткачасовыя дажджы прагназуюцца ў суботу. Ноччу ад 3 да 9 градусаў са знакам плюс, днём да 10-16 градусаў, па паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці да 17-22 градусаў. У нядзелю і панядзелак — яснае надвор'е. Але ў начныя і ранішнія гадзіны пасвяжэе. Уначы тэмпература паветра будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад 8 да 13 вышэй за нуль, па поўдні рэспублікі чакаецца 14-16 градусаў са знакам плюс. У аўторак днём у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, дзённая тэмпература ад 10 да 16, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці да 17-19 градусаў. У сярэдзіне тыдня месцамі прадоўжацца кароткачасовыя дажджы. Уначы будзе ад 1 да 6 градусаў са знакам плюс, днём — плюс 13-19 градусаў, па паўночным усходзе крыху халадней.

## 23 КРАСАВІКА «ЗВЯЗДА» Ў МАСТАХ!

Вясна імкліва ўступае ў свае правы. А хутка і лета — пара водпускаў, канікул, падарожжаў. Безумоўна, паехаць адпачываць усім разам, сям'ёй, што можа быць лепш? А калі так не атрымліваецца?

**Падчас «Выязной прыёмнай»,** якая пройдзе **23 красавіка** на Гродзеншчыне — у Мастах, «Звязда» плануе ўзняць менавіта тэму летняга адпачынку і аздараўлення. **З 11 да 13 гадзін** у Мастоўскім райвыканкаме на пытанні па гэтай праблематыцы адкажуць спецыялісты Міністэрства адукацыі і Упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, прадстаўнікі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва. А **з 14 да 16 гадзін прыём грамадзян** працягнецца на тэрыторыі Адкрытага акцыянернага таварыства «Мастоўдрэў».

Прыходзьце! Мы чакаем вашых пытанняў і прапаноў.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СПЕКУЛЯНТЫ ЎЧЫНІЛІ «ЗАЛАТЫ АБВАЛ»



Цэнтральныя банкі свету на працягу апошніх некалькіх дзён страцілі 500 мільярдаў долараў на падзенні цаны золата. Вінаватыя ў гэтым спекулятыўныя трэйдары, якія пачалі скарачаць колькасць чыстых пазіцый на куплю ф'ючарсных кантрактаў. Прыватныя інвестары таксама панеслі страты. Эксперты не выключаюць, што цяпер яны пачнуць укладвацца ў больш выгадныя актывы. Аднак доўгатэрміновыя інвестары адмаўляцца ад золата не збіраюцца. Агульныя рэзервы сусветных цэнтрабанкаў складаюць 31694 тоны золата, або 19% сусветных запасаў, па даных Сусветнага савета па золаце. На працягу апошняга дзесяцігоддзя каштоўны метал вабіў многіх інвестараў, прапаноўваючы стабільную даходнасць у 20-30%. Да мінулага тыдня золата 18 месяцаў трымалася ў межах дыяпазону 1525-1800 долараў за тройскую унцыю.

### СЕНАТ АДХІЛІЎ АНТЫЗБРОЕВЫ ЗАКОНАПРАЕКТ АБАМЫ

Сенат ЗША ў сераду прагаласаваў супраць законапраекта аб узмацненні кантролю за продажам агнястрэльнай зброі. За яго выказаліся толькі 54 сенатары, 46 — супраць. Між тым, для прыняцця законапраекта была неабходна падтрымка як мінімум 60 членаў верхняй палаты, паведамляе газета амерыканскага кангрэса The Hill. Такое рашэнне Сената выклікала бурнае захапленне зброевага лобі і нанесла чарговы ўдар па планах прэзідэнта Барака Абамы. Ён назваў дзеянні сенатараў «ганебнымі» і палітычна матываванымі, перадае Reuters.

«Гэта быў вельмі ганебны дзень для Вашынгтона», — сказаў прэзідэнт на прэс-канферэнцыі ў Вашынгтоне. Прэзідэнт таксама ўсклаў віну за правал законапраекта на сваіх палітычных апанентаў — рэспубліканцаў, якія, на яго думку, саступілі ціску зброевага лобі, нягледзячы на тое, што, паводле апытання грамадзян, большасць амерыканцаў падтрымлівае меры па ўзмацненні жорсткасці працэдуры праверкі пакупнікоў агнястрэльнай зброі.

### КВІТОК НА МАРС У АДЗІН КАНЕЦ

Галандская арганізацыя Mars One набірае добраахвотнікаў для сваёй праграмы па заснаванні калоніі на Марсе. Праграма будзе праводзіцца ў фармаце рэаліці-шоу. Паспяховыя кандыдаты атрымаюць магчымасць паляцець на Чырвоную планету ў 2023 годзе, аднак з адной умовай — вярнуцца на Зямлю яны больш не змогуць, піша Space.com. Кампанія абяцае адкрыць набор ахвотных ужо «ў бліжэйшы час». Каля 10 тысяч чалавек з усяго свету ўжо выказалі жаданне стаць будучымі астранаўтамі.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ВЫБУХ У ТЭХАСЕ ЗРАЎНЯЎ З ЗЯМЛЁЙ ЧАСТКУ ГОРАДА



Магутны выбух адбыўся на заводзе па вытворчасці ўгнаенняў, размешчаным у заходняй часціцы штата Тэхас (ЗША). У выніку здарэння ад 15 да 75 чалавек загінулі, сотні паранены, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на мясцовыя СМІ.

Паведамляецца, што на тэрыторыі завода загарэўся адзін з рэзервуараў з бязводным аміякам, з якога полымя перакінулася на іншыя пабудовы. У выніку выбуху разбурана некалькі размешчаных на тэрыторыі завода будынкаў, а таксама сярэдняя школа, якая знаходзіцца побач. Пад заваламі могуць знаходзіцца дзеці.

На месцы здарэння працуюць больш за 10 верталётаў і дзясяткі аўтамабіляў хуткай дапамогі, якія развозяць пацярпелых у бальніцы горада Вако і іншых бліжэйшых населеных пунктаў. Таксама паліцыя абвясціла эвакуацыю жыхароў населеных пунктаў, размешчаных у радыусе некалькіх міль ад завода, паколькі ў выніку выбуху ў паветра маглі патрапіць небяспечныя хімічныя рэчывы.

## КОРАТКА

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі накіравала мясцовым выканаўчым органам усіх шасці абласцей і горада Мінска дакументы, згодна з якімі яны могуць пачаць паступовае адключэнне ацяплення.

Міністэрства юстыцыі зарэгістравала рэспубліканскую грамадскую арганізацыю «Беларуская палата моды». Арганізацыя створана для развіцця і прапаганды прафесійнай і аматарскай моды ў Беларусі.

У мінулым годзе ў студзені-лютым колькасць стратных сельгасарганізацый у Беларусі налічвалася 37, або 2,4 працэнта ад агульнай колькасці арганізацый, а ў студзені-лютым 2013 года — 53 (3,5 працэнта ад агульнай колькасці).

Пярвічная арганізацыя Беларускага саюза жанчын Нацыянальнага банка сумесна з Нацыянальным цэнтрам усынаўлення Міністэрства адукацыі і ТАА «Лайт Вэл Арганізэйшн» праводзяць работу па стварэнні інфармацыйнага партала для дапамогі па ўсынаўленні дзяцей, dadomu.by.

## ШТО ЛЕПШ: САМАСТОЙНА СПЛАНАВАНАЕ ПАДАРОЖЖА ЦІ АДПАЧЫНАК ПРАЗ ТУРАГЕНЦТВА?



**Ганна ПУЗІКАВА, мастак ААТ «КІМ», г. Віцебск:**

— Безумоўна, набыць пуцёўку і пасля асабліва не турбавацца ні пра жыллё, ні пра харчаванне, ні пра тое, як будзе арганізаваны твой вольны час, — гэта цудоўна. Але ж мне больш сімпатычны першы варыянт — самастойна арганізаванае падарожжа. Можа, гэта і не так камфортна, але затое вам удасца пабачыць тое, чаго не заўважыць звычайны турыст, якога возяць выключна па адных і тых жа месцах, амаль не даючы магчымасці адысці ад спланаванага маршрута. На маю думку, так можна атрымаць нашмат больш прыемных уражанняў. На жаль, я пакуль што не маю вопыту самастойных падарожжаў, але вельмі мару пра іх. Ідэальна было б паехаць з некалькімі сябрамі. Хутчэй за ўсё, для падарожжа выбрала б Індыю.



**Андрэй ЦЫВА, дызайнер, г. Мінск:**

— Мой выбар віду падарожжа залежыць ад стану: калі я стомлены рознымі справамі і хачу проста паляжаць на пляжы, выберу пуцёўку ў турагенцтве. Тады можна цешыцца сонцам і морам без лішніх думак. Варыянт з самастойна арганізаваным падарожжам — гэта ідэальны план, калі маю сілы на ўсе звязаныя з гэтым клопаты. Што б выбраў для падарожжа па пуцёўцы? Думаю, гэта была б еўрапейская краіна, але з морам і прыемным кліматам. Напрыклад, Манака. Яшчэ з задавальненнем пабываў бы на Блакітным Беразе ў Францыі. А вось для самастойнай паездкі, па-мойму, цудоўна падыходзіць Крым, а яшчэ — Грузія. Цікава таксама паехаць у Тыбет. Я пастараўся б знайсці сабе праваднiка з мясцовых жыхароў і папрасіў паказваць мне месцы, якія знаходзяцца як мага далей ад турыстычных сцежак.



**Ганна РАКОЦЬ, студэнтка Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:**

— Я люблю падарожнічаць без пуцёўкі. Падчас адпачынку мне цікава наведаць некалькі месцаў, а не заставацца ў нейкім адным. Галоўная ўмова — каб побач было мора і галечны пляж, тады ўсё ідэальна. Гэтага крытэрыю пры выбары мэты будучай вандроўкі прытрымліваюся заўжды. Яшчэ адна рэч, здольная захапіць маю ўвагу ў падарожжы — горы. Вельмі люблю хадзіць туды. Здаецца, яшчэ не згадала пра людзей... Пасля ўсяго сказанага вышэй можа ўзнікнуць уражанне, што я аддаю перавагу месцам, дзе вакол як мага менш турыстаў, але гэта не так. Мне падабаецца весяліцца і танчыць, таму звычайна спыняюся ў гарадах, дзе шмат моладзі і дыскатэк. А вось да ўмоў пражывання я не надта патрабавальная: ёсць душ, ложак і кандыцыянер — што яшчэ трэба? Ну, яшчэ, вядома, патрэбны грошы, тады «феерычнасць» якой заўгодна паездкі, самастойнай ці праз турагенцтва, неверагодна ўзрастае.

**Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ПА АБАРОНЕ ЖЫЛЛЁВЫХ ІНТАРЭСАЎ НЕПАЎНАЛЕТНІХ ДЗЯЦЕЙ

**Гэта прадугледжана ўказам №197 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 верасня 2007 года №413», які кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 17 красавіка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Дакумент накіраваны на карэкціроўку Палажэння аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання.

Карэкціроўкі ўносяцца ў мэтах удакладнення парадку рэгістрацыі непаўналетніх дзяцей, а таксама прывядзення названага Палажэння ў адпаведнасць з заканадаўчымі актамі, у тым ліку з Жыллёвым кодэксам Беларусі, які ўступіў у сілу 2 сакавіка 2013 года.

Згодна з указам, для абароны інтарэсаў непаўналетніх дзяцей іх рэгістрацыя будзе захоўвацца па месцы жыхарства бацькоў незалежна ад далейшага месца знаходжання гэтых дзяцей (у дзіцячых дамах, інтэрнатах, апякунскіх сем'ях).

Бацькі, а таксама ўсынавіцелі або ўдачарыцелі, абавязаны зарэгістраваць непаўналетніх дзяцей па сваім месцы жыхарства не пазней за адзін месяц з дня рэгістрацыі нараджэння або пераезду на новае месца жыхарства або ўступлення ў сілу рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні).

У выпадку замацавання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі за дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, жылых памяшканняў рэгістрацыя такіх дзяцей па месцы жыхарства ў гэтых памяшканнях, у тым ліку пасля дасягнення паўналецця, ажыццяўляецца без згоды ўласнікаў, а таксама іншых асоб, зарэгістраваных у гэтых жылых памяшканнях.

Акрамя таго, указам устанаўліваецца парадак рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання ў жылых памяшканнях, якія знаходзяцца ва ўласнасці або карыстанні адначасова дзвюх і больш асоб. У прыватнасці, вызначаюцца асобы, згода якіх патрэбна на рэгістрацыю родных, сваякоў, непрацаздольных утрыманцаў і іншых грамадзян да ўдзельніка агульнай долевай уласнасці, наймальніка жылога памяшкання.

# НА «ТЭЛЕВЯРШЫНІ-2013» БУДЗЕ ГОРАЧА

**Сёння адбудзецца падвядзенне вынікаў IX Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлэвяршыня». «Зоркі» беларускага тэлебачання збяруцца ў чарговы раз, каб пачуць імёны лепшых. Сёлета намінантамі сталі 72 з прапанаваных на разгляд камісіі 209 праектаў. 108 заявак паступіла ад рэгіянальных тэлекампаній. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Уладзімір Ядранцаў на сустрэчы з журналістамі ў прэс-цэнтры Дома прэсы.**

Тое, што сярод усіх заяўленых праектаў у гэтым годзе больш за пяцьдзясят працэнтаў прадстаўлены рэгіянальнымі тэлекампаніямі, не можа не радаваць. «Гэты факт гаворыць пра многае. Сёлета адчувальны якасны скачок і назіралася жорсткая канкурэнцыя. Разнапланавасць тэм, іх глыбокае прачытанне, наяўнасць тэлевізійнай драматургіі выклікалі мноства спрэчак наконт таго, хто ж лепшы» — падзялілася сваімі ўражаннямі Галіна Злабенка, сцэнарыст, член праўлення Саюза кінематаграфістаў Беларусі.

Сярод рэгіянальных тэлеканалаў лідарамі сталі Ліда, Маладзечна, Пінск, Брэст. Тэлекампанія «Магілёў» прадставіла свае праекты ў 20 намінацыях з 24. Што гаворыць пра жаданне працаваць, узровень і магчымасці.

Таксама сёння можна смела гаварыць пра тое, што на беларускім тэлебачанні ёсць «Тэлевізійны дакументальны фільм». Сёлета ў гэтай намінацыі было прадстаўлена 18 заявак. А вось з дзіцячым тэлебачаннем сітуацыя сумная. Як лічыць спадарыня Злабенка, у нас яго амаль не існуе. Між тым менавіта «яно — гэта першая прыступка ў выхаванні сапраўднага грамадзяніна і патрыёта». Не лішнім было б, каб з'явілася намінацыя «Дэбют», дзе маглі б прадставіць вынікі сваёй працы маладыя і таленавітыя людзі, якія працуюць на тэлебачанні каля года, але паспелі заявіць пра сябе.

У сваю чаргу, Вячаслаў Булацкі, загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі БДУ, вылучыў шэраг тэндэнцый сучаснага беларускага тэлебачання і падзяліўся сваімі меркаваннямі. «Па-першае, гэта дастаткова высокі ўзровень працы рэпарцёраў, вядучых шэрагу прадстаўленых праектаў. Па-другое, парадавала тое, што ў тэлевізійнай журналістыцы назіраецца змена пакаленняў. З'явілася шмат маладых, таленавітых журналістаў, якія імкнуцца зарэкамендаваць сябе. І тым самым не дазваляюць разняволіцца вопытным калегам, што сабраліся «спачываць на лаўрах». Калі казаць пра рэгіянальныя тэлеканалы, то тут тэлевізійная журналістыка ёсць, але прафесіяналізм не заўсёды на патрэбным узроўні. І гэта часта абумоўлена адсутнасцю прафесійнай адукацыі».

Пакуль жа пытанні чакаюць свайго вырашэння, творчая тэлевізійная грамадскасць збярэцца сёння на чырвонай дарожцы Палаца рэспублікі, каб авацыямі вітаць сваіх пераможцаў. Сёлета арганізацыяй цырымоніі конкурсу займаецца канал «Сталічнае тэлебачанне».

— Не буду раскрываць тое, што мы падрыхтавалі, але магу сказаць дакладна: будуць нечаканасці і цікавыя знаходкі. Так, вядучымі будуць прадстаўнікі трох нацыянальных тэлеканалаў, — крыху прыадкрыла таямніцу намеснік дырэктара «Сталічнага тэлебачання» Людміла Кавалёва. — Тэлеверсію цырымоніі на нашым канале можна будзе ўбачыць у суботу ў 20:10.

**Алена ДРАПКО.**

# СПАРТЫЎНА-АЗДАРАЎЛЕНЧЫЯ КОМПЛЕКСЫ: ВУЧЫЦЦА ПРАЦАВАЦЬ БЯССТРАТНА

**Учора адбылося пленарнае пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па павышэнні эфектыўнасці работы фізкультурна-спартыўных аб'ектаў.**

Члены камісіі пазнаёміліся з ходам работ па ўзвядзенні хакейнай «Чыжоўка-Арэны» (яно будзе завершана восенню), а таксама наведалі фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Аква-Мінск». І зроблена гэта было невыпадкова. Як вядома, яшчэ летась у лістападзе Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка даў спартыўнаму кіраўніцтву даручэнне выпрацаваць канкрэтныя падыходы па паляпшэнні выкарыстання спартыўных аб'ектаў.

Тут сапраўды ёсць праблемы. Як сказаў, напрыклад, начальнік упраўлення фізічнай культуры Мінспорту Павел Няпрахін, гэта звязана і з недастаткова развітай сістэмай рэкламы спарткомплексаў, і з недахопам пунктаў пракату спартыўнага інвентару, і са слабай работай спартыўных сезонных збудаванняў (якія, тым не менш, прыносяць каля 8 мільярдаў даходу)...

Аб запланаванай у 2013 годзе рэканструкцыі дзеючых і будаўніцтве новых аб'ектаў. распавёў начальнік упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінскага гарвыканкама Аляксей Пракаповіч. Паводле яго слоў, у хуткім часе ў сталіцы будзе праведзена рэканструкцыя спартыўнага комплексу «Арбіта», вялікай спартыўнай арэны стадыёна «Дынама». Парадуюць мінчан і новыя спартыўныя аб'екты: крытыя тэнісныя корты, цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі спецыялістаў па мастацкай гімнастыцы, а таксама па веславанні. Асаблівая ўвага — пытанням будаўніцтва аквапарку і «Чыжоўка-Арэны», якія змогуць прынесці добры прыбытак. Да прыкладу, згодна з бізнес-планам «Чыжоўка-Арэны», 189 мільёнаў долараў, укладзеных у будаўніцтва, напалову акупяцца ўжо да 2015 года. Таксама Аляксей Пракаповіч гаварыў аб незапатрабаванасці ў горадзе вялікай колькасці спартпляцовак. Прычына — іх дрэнная тэхнічная аснашчанасць. А вось у якасці станоўчага прыкладу ён прывёў фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Аква-Мінск», які, уклаўшы сродкі ў добрае абсталяванне, цалкам акупіўся і вось ужо некалькі гадоў працуе бясстратна.

Падчас пасяджэння таксама была падкрэслена неабходнасць развіцця турызму, які прыцягвае ў нашу краіну вялікую колькасць гасцей, і важнасць стварэння поўнага комплексу паслуг, якія прадастаўляюцца спартыўнымі комплексамі.

Падводзячы вынікі сустрэчы, міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко адзначыў, што развіццё фізкультурна-спартыўных збудаванняў, акрамя таго, што дае дзяржаве прыбытак, мае на мэце і галоўнае — спрыяе падтрыманню здароўя духу нацыі.

**Кацярына ДАДЗЕРКІНА.**

# НОВЫ ВІРУС ГРЫПУ ЗА МЕЖЫ КІТАЯ ПАКУЛЬ НЕ ВЫЙШАЎ

**43 лабараторна пацверджаныя выпадкі інфіцыравання людзей вірусам грыпу А (H7N9) зарэгістраваны ў Кітаі, паведаміла Сусветная арганізацыя аховы здароўя 12 красавіка. Усе выпадкі зафіксаваны ва ўсходніх правінцыях Кітая, толькі адзін — у Пекіне.**

Гэты грып праяўляецца тэмпературай цела звыш 38 градусаў, кашлем, болем у горле, задышкай, цяжкім дыханнем, хуткім развіццём пнеўманіі. Магчымы лятальны зыход, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Кітайскія органы аховы здароўя праводзяць даследаванні, каб устанавіць крыніцу інфекцыі гэтага захворвання і выявіць іншыя выпадкі. Пакуль фактычных звестак аб перадачы інфекцыі ад чалавека да чалавека няма. Вакцына для прафілактыкі грыпу А (H7N9) адсутнічае. Вірус адчувальны да азельтамівіру, занамівіру і дэзінфікуючых сродкаў, якія змяшчаюць не менш за 60 градусаў этылавага спірту.

Сусветная арганізацыя аховы здароўя не рэкамендуе ўводзіць нейкія абмежаванні на паездкі або гандаль. Міністэрства аховы здароўя Беларусі рэкамендуе грамадзянам, якія едуць у Кітай, клапаціцца пра прафілактыку: не дакранацца да любых жывёл і птушак; ужываць любое мяса толькі пасля добрай тэрмаапрацоўкі; не ўжываць сырыя яйкі; не набываць ежу ў вулічных гандляроў; часцей мыць рукі, прымяняць для гэтага і дэзсродкі, якія змяшчаюць алкаголь; не дакранацца households бруднымі рукамі да твару, вачэй, роту, носу.

Калі па вяртанні ў Беларусь у вас з'явіліся гарачка, кашаль або задышка, абавязкова звярніцеся да ўрача і паведаміце аб паездцы ў Кітай.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ■ Будзь у курсе

### ДЗЕ «В», ТАМ І «А»

**У Мінску 20 красавіка можна будзе здаць экзамен на катэгорыю «А», не прыязджаючы ў ДАІ. Пра гэта БЕЛТА паведаміла старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы Алена Волчак.**

На адкрыцці мотасезона пройдзе акцыя «Увага, матацыкліст!», накіраваная на прафілактыку дарожна-транспартнага траўматызму з удзелам двухколавага транспарту. Дзяржаўтаінспекцыя дасць магчымасць кіроўцам, якія маюць катэгорыю «В» і жадаюць адкрыць «А», здаць практычны экзамен тут жа перад пачаткам байкерскага шэсця.

Праверка навыкаў кіравання матацыклам пачнецца з 11.00 на пляцоўцы перад Лядовым палацам па вуліцы Прытыцкага. Экзаменуемы (абавязковая мінская прапіска) павінен выканаць шэраг абавязковых элементаў: рух па прамой з пераключэннем перадач з ніжэйшых на вышэйшыя і наадварот; кіраванне на мінімальнай хуткасці, не апускаючы ног з падножкі («калейная дошка»); выкананне паваротаў і разваротаў малога радыуса (габарытныя «круг», «змейка», васьмёрка»). Акрамя таго, усе, хто жадае атрымаць катэгорыю «А», павінны прынесці квітанцыю аб аплаце Br5 тыс. на рахунак УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама за адкрыццё катэгорыі.

У поўдзень мотакалона рушыць ад Лядовага палаца па вуліцы Прытыцкага праз праспект Пушкіна, вуліцы Арлоўскую, Сурганава і праспект Незалежнасці да мемарыяла «Курган Славы». Прыбыццё туды намечана на 13.00.

### ПЕРАНОС АДАБ'ЕЦЦА НА РАСКЛАДЗЕ

**У сувязі з перадсвяточнымі і святочнымі днямі, якія чакаюць нас наперадзе, дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» абвясціла, як будуць выконвацца рэгулярныя рэйсы па міжгародніх і прыгарадных маршрутах.**

Так, у перыяд з 30 красавіка па 19 мая рэйсы па міжгародніх аўтобусных маршрутах, што абслугоўваюцца прадпрыемствам, будуць весціся: 3, 8, 17 мая — па графіку пятніц; 4, 9, 11, 18 мая — па графіку субот; 30 красавіка, 1-2, 6-7, 13-16 мая — па графіках будных дзён; 10 мая — па графіку серады; 5, 12, 19 мая — па графіку нядзельных дзён. У сувязі з пераносам рабочых дзён у маі работа прыгарадных маршрутаў будзе прадугледжана: 30 красавіка, 8, 13,18 мая — як па пятніцах; 1,12, 14 мая — як па нядзелях; 9-11 мая — як па суботах; 17 мая — як па чацвяргах.

### ЯК ПРАЕХАЦЬ НА СУБОТНІК?

**У сувязі з правядзеннем рэспубліканскага суботніка 20 красавіка ў сталіцы работа 30 аўтобусных маршрутаў і 4 тралейбусных будзе арганізаваная па графіку буднага дня.**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», па графіку «рабочай» суботы (асобны расклад) будуць працаваць аўтобусныя маршруты №№25, 67, 88С, 106, 144С, тралейбусныя №№8, 15. У ранішні час пік будзе арганізавана работа аўтобуснага маршруту №71, тралейбусных №№3Д, 57. А вось аўтобусныя маршруты №№84Д, 133, 148С працаваць не будуць. Будзе павялічана колькасць рухомага саставу на 12 аўтобусных маршрутах, 8 тралейбусных і трамвайным маршруце №3. Аўтобусны маршрут №156Э будзе курсіраваць па графіку пятніцы, а прыгарадны №279»АС «Паўднёва-Заходняя» — Атоліна» — па графіку буднага дня. Па шэрагу прыгарадных маршрутаў у гэты дзень таксама прадугледжаны дадатковыя рэйсы адпраўленнем з Мінска.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# КАНЮШЫНУ СЕЮЦЬ САМАЛЁТЫ

**Пакуль тэхніка не можа ўвайсці на адталыя палі, у «першы бой» за будучы ўраджай ідуць самалёты. Лётна-тэхнічны комплекс СВК «Бель» Крычаўскага раёна прыступіў да работы.**

Авіяцыйны атрад у «Белі» з'явіўся ў 2000 годзе. У гэтай веснавой кампаніі ў гаспадарцы лятаюць тры самалёты АН-2. Іх вытворчыя палёты — гэта пасяўныя работы, унясенне ўгнаенняў, хімічная апрацоўка. Самалёты змагаюцца з пустазеллем і распыляюць сродкі абароны раслін. Выкарыстоўваць самалёты ў сельскай гаспадарцы — выгадная справа.

— Калі сёння трактар у поле не ўвойдзе, то самалёт лятаць можа, — гавораць спецыялісты. — І прадукцыйнасць працы ў самалёта большая, чым у любой наземнай тэхнікі. На полі не застаецца каляін, не псуюцца пасевы, зямля роўная і некранутая. Самалёт за гадзіну апрацоўвае больш за 60 гектараў, а за дзень мы можам пасеяць 600 гектараў канюшыны.



Сяргей Буры і яго «Ганначка».

Самалёты «Белі» апошнімі днямі ўжо сеялі канюшыну ў Крычаўскім раёне. Яны працуюць не толькі для сваёй і суседніх гаспадарак, але і ў іншых раёнах.

— Цяпер самалёты асабліва актуальныя, калі трэба ў сціслыя тэрміны правесці сяўбу, — каментуе старшыня СВК «Бель» Валерый Куляшоў. — Вясна сёлета спазнілася, вегетацыя раслін затрымалася, а таму тэрмінова трэба падкарміць азімыя культуры, каб быў добры ўраджай. Таму нездарма з розных раёнаў Магілёўскай вобласці да нас паступілі заяўкі на апрацоўку больш як 30 тысяч гектараў.

За выкарыстанне самалёта трэба плаціць грошы, але ўсё ж не надта вялікія. Трымаць парк самалётаў — справа, якая патрабуе значных выдаткаў. Сумы, у якія абыходзяцца рамонты, набліжаюцца да мільярда рублёў, таму лётнаму парку гаспадаркі дапамагаюць улады і бюджэт.

Лётчыкаў гаспадарка наймае на сезон.

На аэрадроме — сонечная вясна. Самалёты рыхтуюцца да вылету ў Быхаўскі раён. У вузкай кабіне «АН-2» ледзь умяшчаюцца пілоты. Здзіўляе наяўнасць люстэрка задняга агляду: зразумела, не для абгонаў і паваротаў, як у аўтамабілі, для таго, каб назіраць за выкідам насення і розных рэчываў.

Малады пілот з Мінска Сяргей Буры ласкава называе самалёт «Ганначкай».

— Без неба ўжо не магу, — прызнаецца ён. — Ляціш і бачыш зверху лясы і палі — гэта цудоўна.

Сяргей вучыўся ў аэраклубе: тэорыя была ў сталіцы, а на Крычаўшчыне — практыка. Яго сыну не споўнілася яшчэ і года, але яму ўжо падарылі першы цацачны самалёцік.

Начальнік лётна-тэхнічнага комплексу СВК «Бель» Аляксандр Куляшоў у авіяцыі больш за 40 гадоў. Ён родам з Магілёва, а авіяцыяй калісьці зацікавіўся выпадкова — праз знаёмага, які працаваў у аэрапорце. Аляксандр Сямёнавіч з'яўляецца пілотам першага (самага высокага) класа, але, як і кіношны лётчык Мімінo, у вялікую авіяцыю не хоча.

Яго калега Аляксандр Урбановіч працаваў у Магілёўскім аэрапорце авіятэхнікам.

— Рамантаваць самалёты — гэта вельмі адказна, — гаворыць ён. — Тут пасля кожнай аперацыі трэба свой подпіс ставіць, і гэта правільна.

Сапраўды, для лётчыкаў першая справа — самалёты, але для тых, якія працуюць у крычаўскай «Белі», важны яшчэ і добры ўраджай.

**Алена КАЗЛОВА.**

*Крычаўскі раён.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ВАДА ПРАРВАЛА ДАМБУ

**З самай раніцы нечакана для жыхароў вёскі Мардзвін у Петрыкаўскім раёне прыйшла вялікая вада. У дамбе на рацэ Прыпяць побач з населеным пунктам утварылася прамывіна даўжынёй каля 20 метраў. Тут зараз знаходзіцца ўся спецыяльная тэхніка мясцовых прадпрыемстваў меліяратыўных сістэм, ДРСУ-112, Петрыкаўскіх райжылкамгаса, лясгаса... Як расказаў намеснік старшыні Петрыкаўскага райвыканкама Анатоль Фурса, з дапамогай друзу і мяшкоў з пяском прарыў лакалізуецца.**

Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у вёсцы зарэгістравана 66 чалавек, напярэдадні здарэння на 43 падворках знаходзіліся 56 жыхароў, у тым ліку адна дзяўчынка шасці гадоў. Падтопленымі (максімальны ўзровень падтаплення склаў 1,2 метра) аказаліся 15 дамоў з гаспадарчымі пабудовамі. У іх пражывае 24 чалавекі. Пацярпелых няма. Жыхароў апавясцілі праз радыё.

— Служба МНС адразу апавясціла жыхароў вёскі Мардзвін пра стыхію. Зараз там знаходзіцца вялікі атрад МНС з рознымі плывучымі транспартнымі сродкамі. Выратавальнікі ажыццяўляюць эвакуацыю насельніцтва. У вёсцы Мардзвін жыве больш за 50 чалавек. Трэцяя частка населенага пункта знаходзіцца ў нізіне — менавіта туды і хлынула вада. У іншыя яна не павінна трапіць. Таму пацярпелыя людзі (і іх хатняя жывёла — 10 кароў і 18 свінняў) перасяліліся да суседзяў, якія жывуць на ўзгорку. Маёмасць усіх застрахавана. Пакуль што з населенага пункта эвакуіравана толькі адна пажылая жанчына. На «хуткай» яе даставілі ў Ляскавіцкую ўчастковую бальніцу. Магчыма, і іншыя людзі скарыстаюцца такім спосабам эвакуацыі: гасцініца і бальніца гатовы да прыёму насельніцтва.

Харчаваннем, калі спатрэбіцца, гавораць у райвыканкаме, усіх забяспечаць мясцовыя райпо і гаспадарка. Панікі сярод людзей няма. Супрацоўнікамі РАУС арганізавана ахова падтопленых жылых хат. Прычыны прарыву дамбы, якая была ў дастаткова добрым стане, будуць устаноўлены.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ХЛОПЧЫК ПАКАТАЎСЯ НА... КРЫЗЕ І ДРЭВЕ

**У Наваполацку выратавалі хлопчыка, які на рацэ Заходняя Дзвіна плаваў на крызе і ўпаў у ваду.**

— А шостай гадзіне вечара выпадковы мінак патэлефанаваў у службу выратавання і сказаў, што бачыць чалавека, які знаходзіцца на падтопленым дрэве на рацэ Заходняя Дзвіна ў раёне вуліцы Я. Коласа, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Калі выратавальнікі прыбылі на месца выкліку, убачылі, што на адлегласці ад берага каля 10 метраў на падтопленым дрэве знаходзіцца дзіця. На лодцы супрацоўнікі МНС даплылі да дрэва і даставілі хлопчыка на бераг, пасля чаго ён быў перададзены брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. З дыягназам «агульнае пераахаладжэнне арганізма» хлопчык 1999 года нараджэння быў дастаўлены ў Наваполацкую цэнтральную раённую бальніцу.

Як высветлілася, ён катаўся на крызе і ўпаў у ваду. Пасля чаго ўзлез на дрэва, якое знаходзілася побач. Самастойна выбрацца на бераг ён ніяк не мог.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПЕРАКУЛІЎСЯ БЕЛАРУСКІ АЎТОБУС

**У Падмаскоўі на Мінскай шашы каля 2.45 ночы перакуліўся беларускі аўтобус, які ехаў з Мінска ў расійскую сталіцу. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем, і транспартны сродак «лёг» на бок на праезнай частцы.**

У аўтобусе знаходзіліся 20 пасажыраў і два кіроўцы. У выніку здарэння некалькі чалавек атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці. Іх асобы ўстанаўліваюцца. Згодна з інфармацыяй МНС Расіі, чатыры пацярпелыя былі шпіталізаваны ў Мажайскую цэнтральную раённую бальніцу. Пакуль дакладна вядома толькі тое, што яны грамадзяне нашай краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ДВА ПАЖАРЫ З-ЗА СУХОЙ ТРАВЫ

У Брэсце ўжо зарэгістраваны два пажары, прычынай якіх стала выпальванне сухой травы. У абодвух выпадках загарэліся вагончыкі. Адзін з іх — бытоўка будаўнікоў, якая належыць філіялу будаўнічага трэста №8. Прыналежнасць другога металічнага вагончыка пакуль не ўстаноўлена. І ў адным, і ў другім пашкоджаны ўнутранае аздабленне, маёмасць. Вакол палілі сухую траву — агонь перакінуўся на памяшканне. Наступае вясна, эколагі і выратавальнікі заклікаюць: «Не паліце сухую раслiннасць!» Грамадзяне паляць.

**Яна СВЕТАВА.**


## ИНФОРМАЦИЯ о проведении повторного аукциона без условий по продаже недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - здание склада вторсырья, общей площадью 809,6 м² с инвентарным № 630/С-66746, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32А;<br>- здание весовой, общей площадью 107,7 м² с инвентарным № 630/С-66784, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32Б.<br>Объекты продаются одним лотом.<br>Начальная цена: **329 576 000** рублей с учетом НДС 20%.<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 15 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 15 календарных дней после проведения аукциона |
| **Сумма задатка** | **10%** от начальной цены **32 957 600** рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» |
| **Продавец** | **Молодечненское РАЙПО**<br>г. Молодечно, ул. Молодежная, 12,<br>тел.: 8(0176) 739111, 730309 |
| **Организатор аукциона** | **Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1 |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность |
| **Информация по земельному участку** | Объект № 630/С-66746 находится на земельном участке площадью 0,5372 га с кадастровым номером 623881706101000844, расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32А, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания склада вторсырья; Объект № 630/С-66784 находится на земельном участке площадью 0,0805 га с кадастровым номером 623881706101000844, расположенного по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, д. Красное, ул. Станционная, 32Б, назначение – земельный участок для содержания и обслуживания здания весовой |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **30.04.2013 до 16⁰⁰,**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1,<br>Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс»,<br>тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **08.05.2013 в 15⁰⁰,**<br>г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1,<br>Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» |
| **Условия проведения аукциона** | Продавец имеет право отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три дня до даты его проведения. |

Утерянные бланки строгой отчетности «Страховые свидетельства» серии ВС 9882640, 9882641, 9882642 в количестве 3 шт. представительства Белгосстраха по Борисовскому району считать недействительными.
*УНП 101120215*

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0401539 считать недействительным.
*УНП 101883943*


## ■ Погляд

# ЯМАЛ — ЕЎРОПА-2

**У пачатку красавіка 2013 года прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін даручыў «Газпраму» вярнуцца да прапрацоўкі праекта газаправода «Ямал — Еўропа-2» праз Беларусь для паставак газу ў Польшчу, Славакію і Венгрыю. Аб'ём газу, які пастаўляецца, можа скласці каля 15 млрд кубаметраў. У сувязі з гэтым заканамерна пытанне: якія практычныя наступствы гэта можа пацягнуць для Беларусі?**

Як вядома, сёння Беларусь з'яўляецца асноўнай краінай-транзіцёрам для паставак у Еўрасаюз з Расіі нафты, а Украіна — газу. Эксплуатацыя Расіяй «Паўночнага патоку» для транспартавання часткі газу, які раней накіроўваўся ў ЕС праз Украіну, і будаўніцтва газаправодаў «Ямал — Еўропа-2» і «Паўднёвага патоку» можа карэнным чынам змяніць сітуацыю. У выніку Беларусь можа стаць больш важнай транзітнай краінай для Расіі, чым Украіна, і ў плане паставак нафты, і ў плане паставак газу на самы важны для яе рынак — Еўрасаюза.

Гэта лагічна, улічваючы, што Беларусь актыўна ўдзельнічае ў інтэграцыйных праектах з Расіяй, а Украіна — не. У сувязі з гэтым для Расіі яўна бяспечней давяраць самыя важныя праекты найбольш блізкім саюзнікам. Пры гэтым улічым, што па маштабе гэты інвестпраект складзе мільярды долараў, а гэта вельмі выгадны для Беларусі аб'ём работ.

Праўда, уводу ў строй другой лініі давядзецца пачакаць. У выпадку ўхвалення праекта «Газпрам» гатовы пачаць яго будаўніцтва з тым, каб пусціць па лініі газ у 2018—2019 гадах. Пра сур'ёзнасць намераў сведчыць тое, што «Газпрам» папярэдне правёў перамовы з Польшчай, Венгрыяй, Славакіяй на карпаратыўным узроўні, а з Польшчай быў нават падпісаны папярэдні мемарандум. Праўда, паведамленне аб падпісаным з «Газпрамам» мемарандуме стала сюрпрызам для прэм'ер-міністра Польшчы Дональда Туска, які шукае альтэрнатывы для паставак газу з Расіі ў Польшчу.

У той жа час вопыт ужо рэалізаваных праектаў паказаў, што «Газпрам» здольны ўплываць на меркаванні палітыкаў Еўрасаюза, прыцягваючы да будаўніцтва сваіх трубаправодаў буйныя кампаніі з ЕС, значны капітал і лабісцкія магчымасці якіх здольны зламаць волю любога праціўніка новых інвестыцыйных праектаў «Газпрама».

У вяртанні Расіі да праекта будаўніцтва другой чаргі газаправода праз Беларусь важныя і эканамічныя довады. Хутка на рынак ЕС пачне паступаць у вялікіх аб'ёмах сланцавы газ з ЗША, канкурэнцыя цэн абвострыцца і «Газпраму» давядзецца зніжаць кошт транзіту расійскага газу ў ЕС. Ужо даўно падлічана, што беларускі маршрут з'яўляецца найбольш танным для «Газпрама». Гэта падчас размовы з прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным пацвердзіў і кіраўнік «Газпрама» Аляксей Мілер, які адзначыў: «Мы прапрацоўваем варыянты будаўніцтва газаправода з тэрыторыі Беларусі з разуменнем таго, што сёння транзіт праз тэрыторыю Беларусі па трубаправоду «Ямал — Еўропа-1» з'яўляецца самым эканамічна эфектыўным». Дадатковая ветка праз Беларусь дазволіць Расіі з вялікай выгадай для сябе пастаўляць у ЕС вялікія аб'ёмы газу эканомным беларускім маршрутам.

**Вялікія аб'ёмы транзіту газу праз Беларусь азначаюць вялікія паступленні ў беларускі бюджэт. Удасца някепска зарабіць і на будаўніцтве самога газаправода.**

Відавочная і выгада Беларусі — вялікія аб'ёмы транзіту газу праз Беларусь азначаюць вялікія паступленні ў беларускі бюджэт. Удасца някепска зарабіць і на будаўніцтве самога газаправода. Будуць створаны дадатковыя працоўныя месцы пасля яго будаўніцтва. Павысіцца прэстыж Беларусі як галоўнага транзіцёра расійскіх энергарэсурсаў для ЕС і значэнне нашай краіны для Расіі. Рэалізацыя падобнага праекта падкрэсліць і высокі ўзровень даверу паміж Расіяй і Беларуссю, што будзе пазітыўна ацэнена іншымі патэнцыяльнымі інвестарамі. Падобная дынаміка будзе непазбежна ўлічвацца і нашымі еўрапейскімі партнёрамі.

У цэлым рэабілітацыя падобнага праекта яшчэ раз прыцягне ўвагу патэнцыйных інвестараў да выгаднага геаграфічнага становішча нашай краіны, якое з'яўляецца адным з перспектыўных фактараў для мадэрнізацыі беларускай эканомікі. Відавочна, што сёння транзітны патэнцыял Беларусі выкарыстоўваецца яшчэ не ў поўнай меры. Эфектыўнасці яго выкарыстання будзе спрыяць маштабнае будаўніцтва лагістычных цэнтраў, якое поўным ходам ідзе ў краіне. Гэтае будаўніцтва ажыццяўляецца ў адпаведнасці з лепшым замежным вопытам у гэтай сферы. Пасля яго завяршэння наша краіна зможа атрымліваць вялікія даходы з тых жа аб'ёмаў грузаў і павысіць сваю прыцягальнасць для атрымання новых аб'ёмаў транзітных грузаў.



Асноўны фактар для рэзкага павелічэння патокаў грузаў праз Беларусь будзе звязаны з наладжваннем маршрутаў з Азіі ў Еўропу і наадварот. Калі партнёраў з Кітая і Еўрасаюза ўдасца зацікавіць маршрутам паставак тавараў праз Казахстан, Расію і Беларусь, перспектывы росту патокаў грузаў будуць проста грандыёзнымі. Пэўны пазітыў для Беларусі заключаецца і ў нарошчванні паставак грузаў па маршруце з Чорнага мора да Балтыйскага, але тут цяжка чакаць такога ж росту грузапатокаў, як па маршруце ЕС — Азія.

**Сяргей КІЗІМА, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.**

## ПЯТНІЦА, 26 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.20, 22.35** Зона X.
**9.10, 17.40 Серыял «Добры дзень, мама!».**
**10.05, 19.55 Серыял «Джамайка».**
**11.00** Канцэрт.
**12.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.25** Сфера інтарэсаў.
**12.45** Нябачны фронт.
**13.10** Рэальны свет.
**13.45 Серыял «Сваты-6».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 23.30 Серыял «Жамчужына палаца».**
**16.45** «Мая праўда». «Стас П'еха».
**21.00** Панарама.
**22.00** Дыялогі пра цывілізацыю.
**23.20** Дзень спорту.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Гандлёвы цэнтр».**
**12.05** «Добрага здаровейка!».
**13.10** «Модны прыгавор».
**14.15** «Пакуль яшчэ не позна».
**15.05** «Я падаю на развод».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**17.00** «Народная медыцына».
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Дзве зоркі».
**22.45 Закрыты паказ. Маст. фільм «Бедуін».**



**1.45** Начныя навіны.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Сяброўка асобага прызначэння».**
**10.20** Час футбола.
**11.10 Серыял «Блізняты».**
**13.10 Серыял «Бацькі і дзеці», заключная серыя.**
**14.35** Дак. фільм «І дарога паціху зарастае...».
**15.00 Драма «Я помню...».**
**16.45** Мазгавы штурм.
**17.15** Беларуская кухня.
**19.00 Камедыя «Залаты ключык».**
**21.25** КЕНО.
**21.30** Тэніс. Штутгарт. 1/4 фіналу.
